З аналагічным загалоўкам, толькі без пытальнага знака ў «Віцебскім рабочым» № 58 з'явіўся артыкул сімпатычнага мне, хоць і не вельмі знаёмага П. Міхайлава, які абвініў «Выбар» у подласці і мярзотнасці за тое, што «выдзяляецца непрыхаванай непачцівасцю да тых, хто займае інакшую пазіцыю», за «крытычную пальбу ў бок сваіх жа (?) таварышаў па рамяству», і захацелася мне, узяўшы цудоўныя словы аўтара за эпіграф «Любое выданне павінна быць гранічна сумленным і адказным перад сваім чытачом», запытацца: а хто паліць па сваіх?

Хто залемантаваў у «Віцебскім рабочым» пра «Выбар» адразу ж праз некалькі нумароў яго выхаду прыкладна такімі словамі: «інвалід (былы дружыннік) звярнуўся да дэмакратычных журналістаў за дапамогай, але што ім да чалавека з камуністычнымі пераканаыннямі?». Я потым тлумачыла гэтаму даволі паважанаму мной журналісту, што з інваліда зрабілі героя, што мы паднялі справы шматгадовай даўнасці. Але укус быў зроблены. Мы змаўчалі.

Хто ўдарыў карцеччу, калі журналіст А. Пукшанскі паразважаў на нашых старонках аб лёсе шматтыражак, аб сваім лёсе? Ці не «Віцебскі рабочы» напісаў, што «Выбару» хочацца пахаваць усе шматтыражкі? Але, шаноўныя, не ад жадання «Выбара» закрываюцца маленькія газеты ды і не толькі.

Якому выданню належаць гэтыя словы: «цяпер Цвіка «пераканаы» дэмакрат, устанаўлівае сувязі з грашовымі дзялкамі заходніх краін» (№ 23). Ці не ведалі вы, што тут пахне судовым разбірацельствам, ад чаго потым спалохаўся аўтар В. Цярэшчанка? І хто не даў па яго публікацыі выступіць маёру Шайтару, які потым звярнуўся да нас. Плюралісты?

Каму належыць аплёўванне свайго ж калегі—журналіста С. Буткевіча, абвінавачанага ў паклёпе на дэпутата В. Афанасьева. Нават судом пагражалася. Ну і дзе той суд? Ён проста не існуе, а В. Афанасьеў **сапраўды пагнаны з арміі без права атрымання пенсіі за здзекі над салдатамі і за іншыя справы.** Можна, калі прыйдзе час, апублікаваць дакументы за подпісам генерал-маёра юстыцыі.

А ці не пра калегу С. Рублеўскага была брыдота: «Чыя б кароўка мычала?»

Хто дапусціў знявагу журналіста К. Северынца, які сказаў у «Народным слове» праўду аб былым Сенненскім сакратару райкома? Чаму «цярплівыя да іншадумства» не далі слова на старонках свайго выдання зняважанаму калегу?

Так, шаноўны П. Міхайлаў, «якая ні ёсць шматпартыйнасць, але яна ёсць». Ды са старонак вашай газеты не бачна, хоць ёсць яна, ёсць. А бачна з публікацый вашых аўтараў, які вашы чытачы «з году, як памятаюць сябе» (№ 27) вось што: «Ілжэдэмакраты падвялі нас да рынку. Прыватызуюць нашу ўласнасць. Але ці ўцалеюць самі ідэолагі звярынага рынку і праваднікі іх ідэй», «Каму так хочацца прыдушыць «Віцебскі рабочы»—старэйшую газету вобласці?» (№ 27), або «...хочуць знішчыць «ВР» тыя, хто ўмее разбураць, разбураць нашу эканоміку, культуру, аплёўваць гісторыю», «новыя дэмакраты, БНФ ужо ўсё адабралі ў беларускага народа, давялі яго да паўгаладнага існавання. На парозе вясна, а БНФ усе сілы ў такі складаны час аддае рэферэндуму: збірае подпісы супраць беларускага ўрада, за новыя выбары» (№ 26).

А чаго варта палітычная заява ДСПС і абласнога камітэта ПКБ ад 13 сакавіка, дзе гаворыцца пра пакорлівую большасць дэпутатаў, гатовых галасаваць за любую прапанову БНФ, у тым ліку і антынародную Канстытуцыю, дзе тут жа і даверыцца гэтаму ўраду, і выказваецца пратэст супраць рэферэндуму?

Гэты пратэст гучыць з нумара ў нумар. Няўжо ніхто інакш не думае? З газеты відаць, што не. І вы сцвярджаеце: «улада ў руках дэмакратаў». Дык чаму тады вы не пратэстуеце супраць дэмакрата Кулакова, яго аблоскага Савета, ВС, дзе ўсё прымаецца пад націскам БНФ? Чаму не расказваеце, хто і што прыватызуе ў Віцебску. Адкуль яны родам, прыватызатары, у якіх «нечуванае па размаху накапленне капіталу?» Не хочаце чамусьці. Дык, калі вы не супраць дэмакратаў, што сёння ва ўладзе, чаго, як кажуць, «раптаць» аб міфічным знішчэнні? Мусіць, помніце, што адказаў вам пра гэта Кулакоў на сустрэчы з калектывам: **ХТО ВАС ЗНІШЧАЕ!!**

Чаму, шаноўны калега, вас абразіла метафара «ўкормлены ветэран», а не абразіла, што ён даказваў, нібы бацька Пазьняка паліцай? Чаму вы не абразіліся, калі раней «палітычныя субяседнікі» гаварылі, што сам З. Пазьняк супрацоўнічаў з немцамі? А хто пісаў, што лідэр БНФ у час наведвання Віцебска заклікаў да фізічнай расправы над камуністамі? (З. Пазьняк чытаў тую, потым крыху пазней папраўленую паласу).

«Пра адкрытую і наўмысную хлусню» сваіх калег можна было б пагаварыць больш грунтоўна, але думаю, што ў «рабочага і калгасніка хопіць розуму і сумлення разабрацца, што да чаго», якія каштоўнасці адстойваюць абедзьве газеты. Нам жа толькі парадавацца можна, бо «каманда, прыбітая да лодкі «Выбара», усё больш павялічваецца з прафесійных журналістаў накштालт Гаўрылы Полацкага. І слава свежаму ветру і хвалям перабудовы, што дапамаглі нам, першым матросам «Выбара», адшвартавацца ад вялікага камуністычнага крэйсера, дзе нават пахвальвалі некаторых з нас. Праўда, да матэрыялаў бралі тлумачэнні ва ўпраўляючага па справах абкома Дабрыяна, спасылаючыся на веданне Закона аб друку. Толькі вось чамусьці да Ельцына не ехалі за тлумачэннямі да рэпартажаў з Манежнай плошчы. Выходзіць, па сваіх жа ўдарылі карцеччу, таму і не зразумелі мы адзін аднаго. А хацелася, улічваючы рэаліі часу.

«Подла, мярзотна» ўсё, таварышы, бо навідавоку, хто заплёўваў (паліў), а хто адплёўваецца.

Вера АДРАДЖЭНСКАЯ.

Пісьмы ў рэдакцыю

Дзень добры, шаноўная рэдакцыя!

З гарадской прэсы даволі часта чую пра нейкія акцыі, распачатыя веруючымі ўніяцкай канфесіі. Даволі доўгі час намагаюся адшукаць уніяцкую абшчыну ў Віцебску, але марна. Ці не падскажаце мне вы, ці ёсць у Віцебску святар дзеючай грэка-каталіцкай царквы, да якога можна было б звярнуцца з мэтай прыняцця святога ахрышчэння па ўніяцкім абрадзе.

На заканчэнне хачу падзякаваць за вашу газету. Яна нібы выбіяле брудныя плямы на душы пасля знаёмства з прэсай, якая прадстаўляе шырокія слаі чартаўшчыны.

А. ПЯТУРЫН.
г. Віцебск.

АДРАДАКЦЫІ: На ўсіх пытаннях, якія задае аўтар пісьма, раім звяртацца да старшыні Уніяцкай абшчыны Ігара Цішкіна. Тэлефоны: 37-33-56, 4-18-57.

Кляліся быць вернымі...

Нясцерпна холадна было ў дзень 122-ой гадавіны Ульянава—Леніна. Тым не менш, да помніка таго, хто абяцаў **«навякі пабудаваць людзям шчасце»,** прыйшлі ветэраны і кіраўнікі ўладавых структур, ваенны аркестр граў гімн, а юныя ленінцы. пасінеўшыя ад холаду, закарчанелымі рукамі вынімалі з кішэняў гальштукі, павязвалі на шыі і кляліся быць вернымі...

Здзівіла толькі адно: усё ішло не без актыўнага ўдзелу аднаго добра вядомага ў горадзе народнага дэпутата рэспублікі. Таго самага, што выступаў супраць дэпартызацыі, а пасля перавароту выйшаў з КПСС—КПБ і галасаваў за незалежную Беларусь. Сёння зноў ён нізка схіляе галаву перад заснавальнікам партыі, ад якой адрокся, і з асалодай слухае гімн аб агульным пошуку дарог да шчасця.

У гэты час у Менску ідзе чарговая сесія і, пэўна, не хапае кворуму, каб прыняць важнае дзяржаўнае пытанне.

На здымку: плошча Леніна. Пасля «зары савецкай улады».

Есть и такое мнение

Цветы для Ленина!

Впервые в этом году 22 апреля из-за болезни не смог лично возложить цветы к памятнику В. И. Ленина. Счастлив, что это сделали руководители города и области. Что бы мы ни говорили, Ильич—великий человек. И тысячи людей по-прежнему любят его. Спасибо тем, кто не изменил в день рождения Владимира Ильича всенародной традиции.

П. ИВЧУК, ветеран войны и труда.
г. Витебск.



Письма читателей

Сколько у нас контор?


В 70-е годы я работала в облплане и часто приходилось слышать от чиновников: облплан «мозг» облисполкома. Но если дать правильную оценку этому «мозгу», так это в основном работа больше статистического характера, чем экономического.

Прошли годы, поменялась вывеска: Облплан переименовали в комитет по экономике. Увеличился штат работников и зарплата. А жители области оказались в таком положении, что многим приходится задумываться, как выжить.

В конце 80-х годов я «познакомилась» с другой областной конторой—социального обеспечения. И никак не могу понять и разобраться, чем занимается облсобес, какую помощь и поддержку может найти бедный пенсионер или инвалид в облсобесе? А сколько имеется в области таких ненужных областных контор с высокооплачиваемыми работниками? К вышеупомянутым двум можно прибавить облоно, облтоп, облздрав, облкомхоз, отдел цен и др. Все эти «обл» финансируются из бюджета, т. е. из наших карманов. Кто бы посмотрел, нет ли там лишних людей, которых мы кормим?

Н. КОЗЛОВА.

Хто ёсць хто



Ігар Цішкін—сябра Віцебскай Рады БНФ. У мінулым (80-я г. г.) старшыня клуба «Узгор'е», грамадскага аб'яднаньня, якое змагалася з уладамі за захаваньне помнікаў гісторыі і культуры Віцебска. З адраджэнскімі ідэямі, якія высьпявалі ў асяроддзі клуба, прыйшоў ён і ў Беларускі Народны Фронт. З гэтымі ж ідэямі ўдзельнічаў у веснавых выбарах 1990 г. у якасьці кандыдата ў дэпутаты рэспубліканскага парламенту. Дзякуючы падтрымцы выбаршчыкаў, з 12 прэтэндэнтаў выйшаў на другое месца па колькасьці галасоў.

Зараз працуе археолагам МДП «Віцебскпраектрэстаўрацыя».

УЧОРА ЗНОЎ АД ІМЕНІ НАРОДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ніцтва рэспублікі вяршыць наш лёс. А мэта ў іх простая. Ім лепш аддаць нас заходнім прадпрымальнікам на разграбленне. Яны нас могуць сутыкнуць ілбамі.

Спадар Пазьняк загнуў, што мы можам быць незалежнымі. Незалежнымі мы не можам быць, бо ў нас няма золата, залатога эквівалента. Сыравіна ў нас прывазная. Мы адна нацыя з рускімі і ўкраінцамі. Нас многія дзялілі раней. І цяпер ёсць Ельцыны, Шушкевічы, Краўчукі, якія дзеляць. Яны чыхалі на нас. А чаго я павінен дзяліцца, якія інтарэсы я павінен адстайваць у нацыянальнай арміі?

Больш за ўсё ў нашай дзяльбе зацікаўлены заходнія разведкі: СНД—гэта надзеі Гітлера, што збыліся. Дэмакратыя—гэта сацыялізм. Але партакраты скампраментавалі партыю, яны і сёння яе кампраментуюць. Імкнуцца да ўлады. Хопіць вам сядзець, давайце аб'ядноўвацца.

Карэспандэнт: Паважаны інжынер, вы, як у вока ўляпілі: не нясе дабро народу наш урад, не можа ён вырашаць наш лёс. Вы, як і папярэдняя прамоўца, прыйшлі да правільнай высновы, што трэба нейкім чынам «граміць» яго. Дакуль жа кампраментаваць нас, абдзіраць? Аб'ядноўвайцеся, хлопцы, мяняйце яго, не слухайце тых, хто гаворыць, што не трэба. Дакуль за вас будуць рашаць?!

Т. Баркоткіна, дывановы камбінат.

На чалавечай працы ўсе гады набівалі кішэні, вывазілі ўсё за мяжу, а для нас устройвалі розныя суботнікі, розныя рахункі. Куды гэта ішло, мы не ведаем. Але рабілі ўсё з энтузіязмам. Цяпер прадпрымальнікам стала сумна жыць у сацыялістычным грамадстве, яны не хочуць быць таварышамі, а хочуць называцца панамі. Трэба выступаць супраць гэтага.

Карэспандэнт. Я думаю, так! Але, ці ёсць у выказанай горычы якая логіка, якое выйсце? Калі аб'ядноўвацца, каб праз рахункі ды суботнікі даць магчымасць некаму багацець, дык прычым тут слёзы па сацыялізму? Гары ён такі гарам.

Б. Барысаў, токар-расточнік ВА «Электравымяральнік».

Гарбачоў—галоўны віноўнік развала нашай краіны. З першых месяцаў стала зразумела, што яго шлях не той, па якому мы пайшлі. Я гэта бачыў, як быў на 27 з'ездзе КПСС. У краіне развалілі ўсё. А што было дрэннага ў праграме ГК ЧП? Трэба выпусціць іх.

Карэспандэнт. Пасля выступлення токара механічнага завода А. Шталя, члена АДПБ, стала трывожна, бо ўяна адчувалася, што яго прапанове шукаць выйсце ў рэферэндуме, ёсць больш канкрэтная альтэрнатыўная прапанова, якая яскрава вызначалася: граміць, ГК ЧП, расстраляць мафію і дэмакратаў (нават не вызначыўшы, хто ёсць хто).

М. Гаранін, член партыі Жырыноўскага, прыбыў з Рыгі.

Як убачу дэмакрата, рука цягнецца да пісталета. На штыкі трэба такіх падымаць. Поўнасцю салідарны з першай выступаючай: граміць трэба.

Ц. Захарэнка, былы дырэктар завода імя Кірава.

Перабудовай было задумана здрадніцтва, якога не ведала чалавецтва. Партапаратчыкі шкодзілі народу рэалізаваць заваёвы Кастрычніка...

У цэлым народ падтрымліваў путч, як удасканальванне нашага грамадства па руху наперад. З самага пачатку ўсё з падачы партыйных органаў і самага Генеральнага сакратара ачарнялася і аблівалася брудам. Выхоўвалася нянавісць да рэвалюцыі, заахвочваўся распад. Наш лёс аказаўся ў руках дагматыкаў ад партыі. Распаўся Саюз, да кіраўніцтва пацягнуліся сілы, мэта якіх улада і нажыва.

Сёння зноў працоўныя Саюза прад'яўляюць свае патрабаванні да палітыкаў, і сярод іх такія: спыніцеся ў разбурэнні, спыніце балбатню аб суверэнітэтах. Большасць народа сёння не збіраецца на рэферэндуме мяняць свой урад—шыла на мыла.

Карэспандэнт. Выходзіць, тым самым разбуральнікам, прыхватызатарам ды суверэнітэтчыкам, як заявіў дырэктар, можна дзейнічаць і далей. Дзе логіка?

Часнейшы, Грабушкін, ветэраны працы.

Гаварылі аб тым, дзе падзеліся савецкія людзі, савецкія дыктары на тэлебачанні, што не могуць купіць унукам шакаладкі. «Гітлер, каб праснуўся, за развал бы паставіў Ельцыну і Гарбачову залатыя помнікі. Як гэта што шпрыцоў самі не можам нарабіць, ды і цэны такія могуць толькі п'яныя ўвесці. Судзіць трэба ўсіх, а мы рэферэндумы прыдумваем, калі сеяць час».

Карэспандэнт. Слава богу, збор подпісаў правялі да пасяўной, а выбары могуць быць пасля ўборкі. Так, што віціць БНФ не выходзіць. Лепш сапраўды хоць прыблізна ведаць, калі сеюць, калі жнуць.

Выхад у ветэранаў: судзіць і толькі. Думаю, што міжнародны суд над камунізмам можа сапраўды адбыцца, бо самі ветэраны патрабуюць судзіць тых, хто давёў народ да жабрацтва. Толькі не трэба па-бальшавіцку, без суда і следства.

* * *

Ад імя народа ўзяў слова дацэнт медінстытута В. Янчук. Маладому чалавеку з партыі Жырыноўскага ён растлумачыў, што ўсе тут дэмакраты, і чым больш дэмакратыі, тым лепш. Гэта, мусіць, агарошыла аматара штыкоў, бо яму стала не зразумела, на каго іх уздымаць. Але дэмакратычны ўступ навукоўца быў звернуты на галоўнае, аб чым забыліся ў ходзе эмацыянальных выступленняў рабочыя.

—Тут ніхто не гаварыў аб праекце Канстытуцыі. Вазьміце 25 арт. Уся вышэйшая адукацыя пераводзіцца на беларускую мову. Прабачце, гэта што, пераход на дэмакратычны шлях? Гэта што, дэмакраты? Закон аб мовах навязаў БНФ. Я ў Латвіі пражыў многа гадоў. Там хочаш, на рускай мове вывучай прадмет, хочаш—на латышскай. Трэба дзве дзяржаўныя мовы. У БНФ няма праграмы ні эканамічнай, ні культурнага адраджэння. Голая дэмагогія.

Ад рэферэндума нікуды не адыйдзеш. Узнікае пытанне, што нам рабіць? Удзельнічаць! Калі мы не будзем удзельнічаць, ад гэтага выйграюць толькі ініцыятары. Таму ўдзел патрэбны, але трэба сказаць «не» адстаўцы ўрада.

Калі паслухаць, як выступае Зянон Пазьняк, можна падумаць, што роўных яму няма, што ён усё бачыць скрозь зямлю. Але я на яго месцы апублікаваў бы праграму. Ды ў яго яе няма. Ёсць толькі палітычная трасканіна.

Карэспандэнт. Шаноўны навуковец пасля прыняцця некаторых законаў у Латвіі прыехаў у Віцебск, бо лепш гаварыць аб антыдэмакратычнасці Вярхоўных Саветаў, чым вывучыць мінімум слоў з мовы таго народа, дзе даводзіцца жыць.

Трэба ведаць, што Закон аб мовах у Беларускай ССР прыняў Дзямянцееўска-Сакалоўскі Вярхоўны Савет, а не навязаў БНФ. Яго тады не было.

Трэба чытаць праграмы БНФ і другіх партый па эканамічнаму і нацыянальнаму адраджэнню. Яны публікуюцца. Праграма БНФ нават прааналізавана экспертамі. Пагартайце «Народную газету».

Навошта адцягваць рабочых ад цывілізаванага шляху барацьбы за адстаўку ураду шляхам рэферэндуму. З іх жа выступленняў (перачытайце) бачна, што яны гатовы яго граміць. Дык і вам хто не дае вылучыць сваю кандыдатуру? Вы ж не голы дэмагог, як, па вашых словах, Зянон Пазьняк. Вы ж, мусіць, сваю праграму маеце? Дык чаму не апублікавалі, ці хаця б вусна не выказалі? Інакш выснова неабвержная: дэмагогія супраць дэмагогіі. Што, не так?

В. Казлоўскі, выкладчык медінстытута.

Чаму патрэбна мяняць Канстытуцыю? Хто даў права мяняць дзяржаўны лад?

Карэспандэнт. Сапраўды вучоныя нашы навукоўцы. Помню яшчэ мяне вучылі: на змену рабаўладальніцкаму ладу прыйшоў феадальны, на змену феадальнаму... І гэтак далей. Хто ж даў права мяняць эканамічныя фармацыі, ды і кастрычніцкую рэвалюцыю здзяйсняць, савецкую ўладу ўсталёўваць? А я-та думала, што гісторыя, жыццё ўносіць аб'ектыўныя змены. Быў СССР —няма яго, была БССР—няма. А Рэспубліцы Беларусь Канстытуцыя патрэбна, бо гэта—**Дзяржава,** шаноўны вучоны.

* * *

Прачыталі зварот працоўнай Масквы, зачыталі рэзалюцыі і аднагалосна, разам з журналістамі стварылі ці, хутчэй, не стварылі, нейкі каардынацыйны Савет рабочых. Увайшлі ў яго, што юрыдычна неправамоцна, не прадстаўнікі, абраныя калектывамі, а з прысутных і нават непрысутных. Практычна, члены руху за сацыяльную справядлівасць і члены ПКБ. Той жа самы В. Янчук. Цяпер камуністы трыядзіныя пры той жа колькасці і якасці.

Успомнілі (напомніў Янчук) пра праект Канстытуцыі. Тады падняўся **Б. Барысаў.**

—Я не чытаў праекта Канстытуцыі,—наіўна прызнаўся ён,—хоць мне і так усё зразумела, растлумачылі Янчук і Казлоўскі. Канстытуцыя—буржуазная, антынародная, зачытаў ён, у выпадку яе прыняцця наступіць пераварот грамадскага ладу. Таму мы, рабочыя, не прымаем гэты праект.

Карэспандэнт. Паставіла кропку і падумала, навошта было столькі працы, каб паказаць тое, што лепш было б скрыць. Але хай чытач бачыць, хай аналізуе, адкінуўшы мае асабістыя каментарыі, ці мацнець рабочаму руху ў Віцебску, ці ёсць у яго палітычна-інтэлектуальны патэнцыял?

Яўгенія МАЛЬЧЭЎСКАЯ.



На здымку: Пошук шчасця для народа працягваецца.

Слова з крыжа маўчання

ЗА ШТО ТРАПЛЯЮЦЬ ЗА ВАРОТЫ?

Мусіць, праўду казаў наш славуты пісьменнік-зямляк Уладзімір Караткевіч, што беларусаў Бог надзяліў усімі шчадротамі, толькі даў ён ім неразумнае начальства: самаўпраўнае, хапуг розных, што не прызнаюць ні законаў, ні справядлівасці. І гора таму, хто ўздумаў пакрытыкаваць такое начальства, прызвадць яго да сумлення. Так здарылася з Уладзімірам Фёдаравічам Жыгуловым, які доўгія гады прапрацаваў у рамонтнабудаўнічым упраўленні бытавога абслугоўвання, а цяпер—беспрацоўны.

Наважыўся ён нейк указаць на тое-сёе свайму начальніку С. С. Казыру, за што і атрымаў адразу папярэджанне: «Будзеш лезці не ў свае справы, апынешся за варотамі». Але майстар (на такой пасадзе працаваў Уладзімір Фёдаравіч) не супакоіўся, пайшоў, як кажуць, у райком партыі Чыгуначнага раёна, расказаў былому сакратару т. Барзянкову і аб грубасці, і аб выпадках злоўжыванняў-крадзяжоў у РБУ. Барзянкоў, відаць, у вуснай форме ўказаў Казыру аб недапушчальнасці вось такой яго работы. Але вынікі сталі адваротнымі. Грозны начальнік выклікаў да сябе Жыгулова і запытаў: «Ці збіраешся ты працаваць? Час знайсці іншае месца».

Да гэтага запытання Казыра падключыў выпадак, які адбыўся напярэдадні. Ездзіў Жыгулоў у камандзіроўку ў Смаленск, з заданнем справіўся і вярнуўся крыху раней. Ды ў сваякоў як раз надарылася бяда, папрасілі яго адвезці для пахавальнага стала прадукты. Заўважыў гэта начальнік: як так—у час камандзіроўкі ды дома? Без згоды прафкома Жыгулову аб'яўляецца вымова, але ён абскарджвае яе ў абкоме прафсаюза. Выехаў прадстаўнік, сабралі мясцком і рашэннем ад 18 чэрвеня 1990 года канстатавалі: **«Начальніку РБУ С. С. Казыру ўказана на меўшыя месцы ўпушчэнні ў рабоце, а таксама прапанавана адмяніць прыказы, выдадзеныя з парушэннем працоўнага заканадаўства. Пытанні захавання заканадаўства абкомам прафсаюза ўзяты пад кантроль».**

Аднак рашэнне абкома прафсаюза нічога не мяняе. Вымова хоць і адмяняецца, але праследаванні ўзмацняюцца яшчэ больш. У гэты час Жыгулоў працуе інжынерам па тэхніцы бяспекі. Калі ж вяртаецца на сваё месца жанчына, што была ў дэкрэтным адпачынку, над Жыгуловым, замест вяртання на ранейшае месца, навісае пагроза скарачэння: маўляў, не могуць быць два інжынеры па ТБ. Калі ж і тут не праходзіць эксперымент на выжыванне з калектыву, Казыра знаходзіць прычыну заявіць аб неадпаведнасці Жыгулова займаемай пасадзе. Гэта робіцца пасля таго, як ён на аб'екце «Градзірня» саўгаса Рудакова адмаўляецца прыняць бетон нізкай якасці, які мог бы прывесці да разбурэння канструкцый, і не падпісае дакументы аб прыёмцы. Вось тады і рыхтуецца тэрміновае прадстаўленне ад імя савета працоўнага калектыву галоўнаму інжынеру аб неадпаведнасці майстра займаемай пасадзе і яго пераатэстацыі. Але галоўны інжынер В. М. Бірук пад выпіскай з пратакола № 1 ад 30 мая 1990 года дапаўняе: **«Неабходна двухтыднёвая падрыхтоўка майстроў... Тэрміны не рэальныя. Адміністрацыі рашыць пытанне аб назначэнні адказных асоб у камісію».**

Зноў ідзе скарга ў абком прафсаюза, і зноў атэстацыю, як неправамоцную, выпраўляюць адмяніць. Аднак эпапея праследаванняў не заканчвалася. Узнікае казус з афармленнем працэнтнага аб'ёма работ на будаўніцтве пральні. Жыгуловым перад водпускам было зроблена папярэдняе завышэнне. Вельмі і вельмі нязначнае. Пасля кантрольнага замеру ён падпісаў акт. Прыказ жа, на аснове якога прадпісвалася пакаранне, меў зусім іншыя лічбы. Навідавоку аказалася злоўжыванне уладай і перавышэнне паўнамоцтваў. Зноў ад 13 лістапада за подпісам старшыні абкома прафсаюза В. Ляховіча ўказваецца: **«Прыказ № 88 у частцы пакарання штрафам выданы з парушэннем** закона, так **як адміністрацыя такім правам не карыстаецца. Т. Казыру дадзена прадпісанне аб адмене ў месячны тэрмін указанага прыказу».**

Шмат пісьмаў з прычыны розных парушэнняў адміністрацыі накіроўваў У. Жыгулоў у самыя розныя інстанцыі: райком, гарком, абком партыі, тэлеграмай звяртаўся у адрас XXXI з'езда КПБ, асабіста да У. Грыгор'ева, як да старшыні абласнога Савета і тады яшчэ дэпутата СССР. Апошні нават даў указанне размножыць заяву-скаргу Жыгулова ў органах МУС, пракуратуры, «абахэсэс», КРУ і г. д. з мэтай праверкі. Звярнуўся Жыгулоў і ў рэдакцыю «Віцебскага рабочага». Журналіст М. Конан дапамог звязацца з пракуратурай, каб пацвердзіць факты прыпісак, водпуску будматэрыялаў і іншых злоўжыванняў. Але справу чамусьці перадалі ў пракуратуру Чыгуначнага раёна, дзе яна і заглохла. Нягледзячы на тое, што фінансавыя і іншыя парушэнні мелі месца ў РБУ, аб чым сведчаць прамежкавыя праверкі і адказы, так, напрыклад, ад 27 лістапада 1991 года, ва ўзбуджэнні крымінальнай справы было безматыўна адмоўлена. Аднак факт застаўся фактам. Сумесная праверка Чыгуначнага РАУС разам з КРУ Міністэрства фінансаў БССР канстатавала: **«Па выяўленых фактах завышэння аб'ёмаў выкананых работ і расцэнак, парушэння працоўнай дысцыпліны накіравана пісьмо начальніку ўпраўлення бытавога абслугоўвання Ю. А. Галыкіну для прыняцця адпаведных мер уздзеяння да вінаватых і вяртання незаконна атрыманых грашовых сродкаў».**

Як бачна, прызнана, што былі вінаватыя ў незаконным прысваенні грашовых сродкаў.

Галоўны кантралёр-рэвізор КРУ Ю. У. Наважылаў ад 27 чэрвеня 1991 года паведамляе таксама: **«Частка фактаў праверана і некаторыя з іх пацвердзіліся, аднак неабходна яшчэ правесці кантрольны замер будаўніцтва жалезабетоннага цэху. Вынікі праверкі будуць паведамлены дадаткова».** Зноў, ёсць прызнанне парушэнняў, але чамусьці няма «вынікаў дадатковай праверкі».

«У сувязі з неабходнасцю правядзення кантрольных замераў і даследавання значнай колькасці дакументаў,—адказвае старшыня абкома прафсаюзаў В. Ф. Ляховіч (2.06.91 г.)—тэрмін праверкі абласным Саветам працягнут». Але ж дакуль?

І яшчэ адзін дакумент, падпісаны намеснікам начальніка ўпраўлення Б. І. Пагадаевым: **«Устаноўлена, што рамонт цеплатрасы па в. 8-я Чкалава павінна было весці РБУ, аднак яно заключыла дагавор на выкананне гэтых работ з кааператывам «Цеплатэхніка», пры гэтым устаноўлена завышэнне аб'ёмаў работ на 6.463 рублі...**

...Начальнік РСУ т. Казыра пазычыў панелі пад гарантыйнае пісьмо аб іх вяртанні ў І кв. 1991 года БУ-80 «Промбудмантаж», гэтыя панелі ўключаны ў будаўніцтва цэха, якое будавала РБУ. Аднак панеляў у БУ-80 не было ў наяўнасці, водпуск іх РБУ не афармляўся, якіх-небудзь разлікаў за іх ці вяртанне РБУ не зроблена.

...былы механік т. Сугак сапраўды адвёз сваёй маці ў Нікалаеўскую воласць машыну дошак. Дакументаў на іх водпуск не прад'яўлена. Сам Сугак скрываецца, факт праверыць не прадстаўляецца магчымым. (Цікава, пацвердзілі, што адвёз, але няма магчымасці праверыць?!)

...за дапушчаныя парушэнні фінансавай дысцыпліны т. Казыру аб'яўлена строгая вымова, матэрыялы праверкі будуць разгледжаны на калегіі ўпраўлення ў кастрычніку 1991 года».

Сумныя справы. У якім толькі грамадстве можа такое быць, бо прайшоў ужо кастрычнік 1992 года. Застаўся без работы Жыгулоў, выжылі бясконцым праследаваннем. А Казыра ўсё казырае, бо мусіць ніхто не зацікаўлены, каб «вынікі праверкі былі паведамлены дадаткова». А іх, гэтых вынікаў, чакае Уладзімір Фёдаравіч, таму і піша ён ад 4 сакавіка 1992 г. пракурору Чыгуначнага раёна: **«Я лічу, што факты злоўжывання начальніка РБУ С. Казыры ўстаноўлены кампетэнтнымі органамі і супраць яго павінна быць узбуджана крымінальная справа. Каб дабіцца справядлівасці, буду звяртацца ва ўсе пракурорскія інстанцыі і ў рэдакцыю дэмакратычнага друку. На аснове сказанага прашу: адмяніць пастанову аб адказе ва ўзбуджэнні крымінальнай справы супраць Казыры С. С. і аднавіць яе ўзбуджэнне».**

Наша газета падтрымлівае заяву-скаргу У. Ф. Жыгулова і просіць пракуратуру заняцца расследаваннем.

Вера АДРАДЖЭНСКАЯ.

Актуальная проверка

Сколько обрата на брата

Известно, что в молочных продуктах радиоактивные металлы концентрируются (оседают) в сыворотке, или обрате. Вот почему группа проверки в составе Л. Назаренко, В. Прищепова и И. Степанова на гормолзаводе заинтересовалась результатами анализов обрата. Однако и директор Н. Брусевич, и гл. инженер В. Кулиев, и зав. лабораторией А. Филиппович в один голос заявили, что таких данных нет, поскольку обрат идет обратно—в колхозы и совхозы для поения поросят и телят. На всякий случай мы все же поинтересовались, не идет ли сыворотка на на хлебокомбинат, но нас вежливо успокоили: когда-то, мол, давно, поставляли, но теперь... боже упаси.

По итогам проверки работников гормолзавода вроде даже похвалить надо было: не было раньше лаборатории, а теперь есть, приобретены приборы. Но что-то мешало. В самой лаборатории—чуть-чуть превышен допустимый уровень радиации. Усомнились мы и в правильности заведенного порядка, когда проверка сырья на радиоактивность проводится не с колес, а только после слива поступившего молока в общие емкости. Хотя как-то и не удобно было не верить авторитетным заявлениям, мы все же решили поинтересоваться, верно ли, что хлебокомбинат ни теперь, ни с чернобыльской поры не получает с гормолзавода непроверяемой на радиоактивность сыворотки.

И вот перед нами справка о количествах молочной сыворотки, полученной с гормолзавода хлебокомбинатом. Итак, в 1990 году поступило 3200 тонн, в 1991 году—777 тонн, в январе текущего года—49,4 тонны. На документе—подпись зам. начальника планово-производственного отдела Т. Синицы.

Возникают вопросы: 1. Насколько ответственно относятся к своему долгу руководящие и контролирующие работники гормолзавода? 2. Сколько какого обрата пришлось на брата за шесть послечернобыльских лет? Первым вопросом впору заняться местным властям. Второй вопрос наиболее важен и на него частично смогла ответить экологическая контролирующая группа. С февраля сего года поступления сыворотки на хлебокомбинат прекращены. А до этого? Если с гормолзавода сыворотка шла бесконтрольная, то с организацией в 1991 году службы радиологического контроля на хлебокомбинате необходимая проверка проводилась. В отдельных случаях оперативно принимались меры (так было с сухой сывороткой, поступившей из Слуцка, а также с арахисовыми орехами и т. п.). Что касается сыворотки Витебского гормолзавода, то, к счастью, она по меньшей мере с 1991 года контролировалась в лаборатории хлебокомбината, однако приборы фиксировали лишь то, что содержание радионуклидов во всех случаях было менее 5.10.9 кюри/кг, а вот сколько именно—сия тайна велика есть, так как предельно допустимая норма и порог чувствительности имеющихся приборов в данном случае совпадают. Очевидно, необходимо приобрести более совершенные, с большей степенью точности приборы, а сам контроль сделать более жестким.

Есть в этой грустноватой истории и тайна, покрытая мраком. Какое количество радионуклидов поглотили вместе с хлебом и булочками витебляне в 1986—1990 годах? Повидимому, только медицинская статистика способна пролить свет на подобные вопросы. И все это наводит на невеселые размышления в дни шестой годовщины начала чернобыльской эры на землях белорусских.

Л. НАЗАРЕНКО,
В. ПРИЩЕПОВ,
И. СТЕПАНОВ.

Наступны нумар выйдзе 20 мая 1992 г.



УЧРЕДИТЕЛЬ:
Витебский городской клуб избирателей «За демократические выборы».

Главный редактор
Леонид ЦВИКА

Художник Г. Кликушин.
Фотографии М. Михайлова.
Адрес редакции: 210601, г. Витебск, ул. Гоголя, 17, тел. 37-35-06, 37-28-44.

Текущий счет редакции № 200700962 в Витебском коммерческом банке («Витькомбанк»). Код (МФО) банка 150801701.

Газета набрана и отпечатана офсетным способом в Витебской укрупненной типографии им. Коминтерна: гор. Витебск, ул. Щербакова-Набережная, 6.

Полиграфисты: **В. Корунас, Т. Халеева, Л. Дроздова, А. Каспорович, Д. Малышев, Б. Платовский.**

Номер подписан к печати 6.05.92 г. в 17.15.
Зак. 30 41 Тираж 2500.

Цена 80 коп.